# ТЭАРЭТЫЧНА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ ЛІБЕРАЛЬНЫХ ПАРТЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТ.

***П. А. Трубчык,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў*
*УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”*

У апошнія дзесяцігоддзі сярод характэрных тэндэнцый у айчыннай гістарыяграфіі вылучылася імкненне да пераасэнсавання месца гісторыі ў сістэме навуковых ведаў пра чалавека і грамадства, яе сацыяльнага статуса. Гэтыя тэндэнцыі спалучаюцца з ростам цікавасці да сучасных тэарэтычна-метадалагічных падыходаў і спробамі ажыццяўлення пэўнага культурна-гістарычнага сінтэзу. Аднак ва ўмовах суіснавання канкурэнтных пунктаў гледжання, на ўзроўні гістарыяграфічнай практыкі такія спробы выклікаюць пэўныя метадалагічныя цяжкасці. У такой сітуацыі важна прааналізаваць рэальную сукупнасць гістарычных прац, каб вылучыць перадумовы, якімі карыстаюцца гісторыкі ў эмпірычным даследаванні і вызначыць, ці няма ў гэтых перадумовах унутраных супярэчнасцей, наяўнасць якіх абясцэньвае вынікі даследавання. Таксама, важна зразумець, як будуецца аб“ект гістарычнага даследавання, якія канкрэтныя навуковыя працэдуры вынікаюць з таго ці іншага тэарэтычнага падыхода.

У дадзеным артыкуле робіцца спроба вызначыць гэтыя асаблівасці на прыкладзе гістарыяграфіі ліберальных партый на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. Пры гэтым галоўнай задачай ставіцца не падрабязнае гістарыяграфічнае апісанне ўсёй колькасці прац, прысвечаных адзначанай вышэй праблеме, а аналіз тэарэтычных падыходаў да даследавання ліберальных партый і перспектыў іх выкарыстання ў гістарыяграфіі.

Вывучэнне ліберальных партый на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, ў тым ліку і на беларускіх землях пачалося ў пачатку XX ст. Гісторыкі сабралі шмат фактычнага матэрыялу, а таксама прапанавалі шэраг канцэпцый, якія на пэўны час вызначылі рамкі даследаванняў дадзенай праблематыкі. У іх аснове ляжаць тры галоўныя напрамкі грамадскай думкі: кансерватызм, лібералізм і сацыялізм.

У аснове кансерватыўнага погляду на афармленне і дзейнасць ліберальных партый ляжыць сістэмаўтваральная ідэя аб тым, што лібералізм як параджэнне заходняй цывілізацыі нехарактэрны гістарычным рэаліям Расійскай імперыі, якая ідзе сваім шляхам. Ліберальныя ідэі, перасаджаныя на расійскую глебу, апынуліся дагматычнымі, іх засвоіла адарваная ад народа інтэлігенцыя, якая ўзяла курс на барацьбу з гістарычнай уладай (манархіяй). Гэта дзейнасць спрыяла крушэнню існуючай сістэмы, што ў сваю чаргу расчысціла дарогу бальшавікам. Пры такім падыходзе лібералы з'яўляюцца ледзь не галоўнымі вінаватымі рэвалюцыйных узрушэнняў пачатку XX ст. Дадзеныя тэарэтычныя ўстаноўкі вызначылі як «выкрывальную», «абвінаваўчую» скіраванасць, так і тэматыку работ аб ліберальных партыях. Аўтары кансерватыўнага напрамку ніколі не лічылі патрэбным сур'ёзна аналізаваць сістэму поглядаў і каштоўнасцяў ліберальнага руху на беларускіх землях, ідэалогію і праграмы іх палітычных партый. У дасавецкі і савецкі перыяды гэта тэматыка разглядалася толькі на публіцыстычным узроўні, у сучасных працах амаль цалкам адсутнічае. Галоўнае, што цікавіць у лібералізме аўтараў дадзенага кірунку, – гэта практычная дзейнасць ліберальнай апазіцыі з пункту гледжання выяўлення яе ролі ў рэвалюцыйным працэсе ў пачатку XX ст.

Лібэральная тэарэтычная думка зыходзіць з прыярытэту правоў асобы, якія могуць рэалізавацца ў рамках грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы. Найважнейшая мэта лібералізму заключаецца ў забеспячэнні мірнага эвалюцыйнага развіцця грамадства з улікам інтарэсаў розных класаў і сацыяльных груп. Пры такім падыходзе лібералы ў пачатку XX ст. паўстаюць у якасці рэфарматараў, распрацаваўшых сваю мадэль грамадскай перабудовы дзяржавы, якую імкнуліся ажыццявіць. Адсюль вынікае неабходнасць вывучэння ўсяго шэрагу праблем, звязаных з гісторыяй ліберальных партый, што магчыма на аснове комплекснага і сістэмнага падыходаў.

З усіх напрамкаў сацыялістычнай грамадскай думкі найбольшую ролю ў вывучэнні лібералізму адыграў марксізм, які стаў тэарэтычна-метадалагічнай асновай для ўсёй савецкай гістарыяграфіі. Закладзеная ў марксізме метадалогія класавага падыходу патрабавала разглядаць усе з'явы грамадскага жыцця з пункту гледжання класавай барацьбы. Лібералізм разумеўся як ідэалагічнае абгрунтаванне панавання буржуазіі і як буржуазная грамадска-палітычная плынь. У гэтай сістэме каардынатаў лібералы ў пачатку XX ст. выглядалі як прыхільнікі капіталістычнага развіцця краіны, якія імкнуліся, з аднаго боку, правесці ўмераныя буржуазныя рэформы, а з другога – не дапусціць сацыяльнай рэвалюцыі. Савецкія гісторыкі на канкрэтна-гістарычным матэрыяле павінны былі даказаць буржуазную класавую прыроду ліберальнага руху і контррэвалюцыйны характар яго дзейнасці. Гэтыя вядучыя тэзісы прадвызначылі «выкрывальніцкі» характар гістарычных прац, іх канцэптуальную і тэматычную накіраванасць.

У вывучэнні гісторыі ліберальных партый на беларускіх землях выразна прасочваецца ўплыў палітыкі, ідэалогіі на фарміраванне навуковых канцэпцый. Гаворка ідзе не столькі аб прамым сацыяльным заказе, што было характэрна для дасавецкага і савецкага перыядаў, колькі пра пэўныя светапоглядныя ўстаноўкі аўтараў, якія дыктавалі ім погляды на ліберальны рух. Многія гісторыкі зыходзілі з загадзя сканструяванай мадэлі, якая вынікала не з аналізу ўсяго комплексу крыніц, а з «ідэі», якая запатрабавала падбор адпаведных фактаў. У гэтым кантэксце галоўным і найбольш сур'ёзным недахопам значнай часткі навуковых прац па ліберальнай тэматыцы было штучнае адлюстраванне ў крыніцах загадзя сфармуляванай канцэпцыі. Грамадска-палітычнае становішча, якое склалася вакол ліберальнай тэматыкі ў дасавецкі, савецкі перыяды і ў эміграцыі, не дазваляла адмовіцца ад так званай апрыёрнай методыкі. У выніку, даследчыкі знаходзілі ў гісторыі ліберальнага руху менавіта тое, што і належыла знайсці, падганяючы не цалкам «якія падыходзілі» дадзеныя пад ужо вядомую карціну. Таму гістарыяграфія ліберальных партый не з'яўляецца лінейным працэсам, пры якім пашырэнне гістарычных ведаў аўтаматычна вядзе да развіцця і паглыблення гістарычнай думкі.

Пачынаючы з 1930-х гг. савецкая гістарыяграфія зыходзіла з тэзіса пра супрацьстаянне ў дарэвалюцыйнай Расіі двух палітычных лагераў: рабочых і сялян, з аднаго боку, царызму і буржуазіі – з другога. У адной групе з урадам апынуліся ліберальныя партыі, чыя роля заключалася ў дапамозе самадзяржаўю душыць рэвалюцыю. У ліку галоўных характарыстык ліберальнага руху называліся антырэвалюцыйная накіраванасць і манархізм. Падкрэслівалася варожасць лібералізма рэвалюцыйнасці і дэмакратызму, палітычная несамастойнасць. Пасля смерці І. В. Сталіна ў савецкай гістарыяграфіі зацвердзілася меркаванне аб існаванні ў дарэвалюцыйны перыяд трох палітычных лагераў: ўрадавага, ліберальна-буржуазнага і рэвалюцыйна-дэмакратычнага, што вынікала з ленінскай публіцыстыкі і метадалогіі класавага падыходу. Гісторыкі сталі бачыць у лібералах асобную палітычную сілу, якая мела свае мэты і праграму, якія далёка не заўсёды супадалі з інтарэсамі самадзяржаўнай улады. У той жа час прынцыповае стаўленне да ліберальнага руху не змянілася – тэзісы аб іх «буржуазнасці» і «контррэвалюцыйнасці» ніхто не ставіў пад сумненне, усе характарыстыкі лібералізму па-ранейшаму аказваліся вытворнымі ад яго класавага характару.

Любыя крокі лібералаў, накіраваныя на вырашэнне сацыяльных супярэчнасцяў мірным шляхам, на дасягненне кампрамісу з уладай, разглядаліся як абарона існуючага ладу, як імкненне ўмацаваць ўладу буржуазіі. Тым не менш пераход да тэорыі «трох лагераў» быў істотным крокам наперад, таму што ён дазваляў больш адэкватна вывучаць лібераллыны рух – яго ўжо не атаясамлівалі з урадавым лагерам. Усе лепшыя дасягненні савецкай гістарыяграфіі ў гэтай галіне абапіраліся на дадзеную тэорыю, з'яўленне якой супала па часе з перыядам «адлігі» і спробамі пасляваеннага пакалення савецкіх гісторыкаў творча паставіцца да марксісцкай парадыгмы.

Падзенне савецкай дзяржавы прывяло да непазбежнага перагляду тэарэтыка-метадалагічных падыходаў гістарычнай навукі. Адны гісторыкі сталі адмаўляць кагнітыўна-метадалагічныя асновы ўсёй савецкай гістарычнай навукі, следствам чаго як правіла стала пэўная метадалагічная безуважлівасць і зыход у пошуках «аб'ектыўных», «дакладных» фактаў у наратыўна-апісальную гісторыю. Іншыя працягвалі і абнаўлялі савецкую гістарыяграфічныя традыцыю, спалучаючы гэты падыход з спробамі яе крытычнага асэнсавання. З іншага боку, многія даследчыкі сталі асвойваць ідэі, канцэпцыі, падыходы заходняй гістарыяграфіі і ўвасабляць іх у канкрэтных гістарычных даследаваннях. Усе гэтыя тэндэнцыі характэрныя і для гістарыяграфіі ліберальнага руху на беларускіх землях. Большасць работ, напісаных па дадзенай тэматыцы, не прэтэндуючы на якое-небудзь метадалагічнае новаўвядзенне, ідуць у рэчышчы традыцыйнай пазітывісцкай гістарыяграфіі, у якой прынята аддаваць прыярытэт дакументальна выверанаму факту.

Найважнейшая тэарэтыка-метадалагічная праблема сучаснай гістарыяграфіі заключаецца ў вызначэнні зместу паняцця «лібералізм». На постсавецкую гістарыяграфію істотны ўплыў аказалі эмігранцкія дыскусіі на гэтую тэму, якія былі ініцыяваны ў 1920-я гг. В. А. Маклаковым. Ён прапанаваў разумець пад лібераламі людзей, якія выступалі за эвалюцыйнае развіццё дзяржавы па заходнім шляху. Для В. А. Маклакова лібералізм як эвалюцыйны працэс не можа мець нічога агульнага з рэвалюцыяй. Адсюль вынікаюць абвінавачванні ў адрас кадэцкай партыі, якая перайшла на бок рэвалюцыі [2]. Такі падыход выклікаў супярэчанні П. Н. Мілюкова, які лічыў недапушчальным ставіць дасягненне мэты ў безумоўную залежнасць ад спосабу дзеяння, рэвалюцыянерам можа стаць пры вядомых абставінах і ліберал. У сучаснай гістарыяграфіі некаторыя аўтары пагаджаюцца з пазіцыяй В. А. Маклакова, не ўлічваючы, што радыкальная тактыка кадэтаў шмат у чым была абумоўлена канкрэтна-гістарычнай сітуацыяй у пачатку XX ст.

Эміграцыйны гісторык сярэдзіны XX ст. В. У. Леантовіч прапанаваў кансерватыўна-ліберальны падыход да паняцця «лібералізм», згодна з якім сапраўдным з'яўляецца выключна кансерватыўны лібералізм, у аснову якога пакладзены ідэі прыярытэтнасці прыватнай уласнасці, грамадзянскай свабоды і гістарычнага традыцыяналізму. Пры гэтым палітычная свабода выступае толькі як «дадатак» свабоды грамадзянскай.

Пры такім падыходзе «сапраўднымі» лібераламі з'яўляліся толькі тыя палітычныя партыі, якія імкнуліся аказаць падтрымку ўладзе ў справе правядзення рэформаў (напрыклад, акцябрысты). Кадэцкую партыю В. У. Леантовіч лічыў не ліберальнай, а радыкальнай за яе канфрантацыйнае стаўленне да існуючай улады [1, с. 6].

Як інструментальны падыход В. А. Маклакова (лібералізм як інструмент эвалюцыйных пераўтварэнняў), так і інстытуцыянальны падыход В. У. Леантовіча істотна пацяснілі ў 1990-я гг. традыцыйны савецкі погляд на лібералізм як буржуазную ідэалогію. У той жа час шматлікія даследчыкі, не прыняўшы тэарэтычных пабудоў эмігранцкіх аўтараў, імкнуліся знайсці альтэрнатыўны падыход, абапіраючыся на сістэму поглядаў саміх лібералаў. Сур'ёзныя тэарэтычна-метадалагічныя дыскусіі на гэтую тэму вяліся не толькі гісторыкамі, але і філосафамі, сацыёлагамі, палітолагамі і іншымі прадстаўнікамі гуманітарных навук.

В. В. Шалахаеў прааналізаваўшы розныя падыходы да вызначэння паняцця «лібералізм», прыйшоў да высновы, што сістэмаўтваральнай ў лібералізме з'яўляецца ідэя індывідуальнай свабоды, а ўсе астатнія структурныя элементы, якія складаюць сістэму ліберальных каштоўнасцей, выконваюць «функцыі перадумоў і ўмоў для найбольш адэкватнай самарэалізацыі чалавека» [5, с. 20].

А. М. Медушэўскі, лічачы сістэмаўтваральным для лібералізму паняцце правоў асобы, адзначае, што канкрэтная праграма лібералізму змяняецца ў адпаведнасці з тым, дэфіцыт якіх правоў (эканамічных, нацыянальных, сацыяльных, палітычных, рэлігійных) асабліва адчувальны для дадзенага грамадства. Адсюль і вынікае раней адзначаная супярэчнасць: «пастаяннае змяненне формаў ліберальнай ідэалогіі і нават некаторых яе змястоўных параметраў» [3, с. 43].

Л. І. Новікава і І. М. Сіземская разумеюць пад лібералізмам асаблівы тып сацыяльна-палітычнага развіцця, які ўпісваецца ў парадыгму, ідэйныя ўстаноўкі якой маюць пастаяннае ядро. У аснове гэтай парадыгмы ляжыць прызнанне абсалютнай каштоўнасці чалавека, прыярытэт свабоды і інтарэсаў канкрэтнай асобы ў адносінах да грамадства, перавага метадаў эвалюцыйна-рэфармісцкіх пераўтварэнняў грамадскіх структур метадам радыкальным, рэвалюцыйным [4, с. 124].

Дадзены тэарэтычны падыход прымушае перагледзець традыцыйны марксісцкі погляд на буржуазію як галоўны сацыяльны носьбіт лібэральных каштоўнасцей. У адпаведнасці з ім, у ліберальным руху няма «прывілеяванага» сацыяльнага носьбіта і палітычнага суб'екта, тая ці іншая група становіцца носьбітам ліберальных ідэй не з прычыны нейкіх яе ўласцівасцей, а калі ў «дадзенай сітуацыі яна бачыць магчымасць задавальнення сваіх памкненняў ва ўсталяванні палітыка-прававога рэжыму роўнай свабоды для ўсіх (ва ўсякім выпадку, палітычна значных) грамадскіх груп» [4, с. 125.]. Такі падыход тлумачыць тэзіс аб «пазакласавасці» кадэцкай партыі і паказвае абмежаванасць марксісцкай метадалогіі з пункту гледжання прывязкі ліберальнага руху да пэўнага сацыяльнага пласта – буржуазіі.

Такім чынам, у цэлым у айчыннай гістарыяграфіі ліберальнага руху на беларускіх землях у пачатку XX ст. прадстаўлены тры асноўныя канцэпцыі: лібэральная, кансерватыўная і сацыялістычная. У сувязі з гэтым задача гістарыёграфа заключаецца ў аналізе таго, наколькі адэкватна прадстаўнікі розных тэарэтыка-метадалагічных падыходаў вывучалі гісторыю ліберальных партый. Крытэрыі навуковасці або неабгрунтаванасці любога падыходу заключаюцца ў ступені іх адпаведнасці аб'ектыўнай логіцы гістарычнага развіцця, іншымі словамі, іх праўдзівасць і навуковасць будзе прама прапарцыйная меры іх адэкватнасці вывучаемых з'яў.

## 🕮 БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Леонтович, В. В. История либерал изма в России. 1762–1914. / В. В. Леонтович – Москва: Рус. путь, Полиграфресурсы, 1995. – 550 с.
2. Маклаков, В. А. Власть и общественность на закате старой России (воспоминания современника) / В. А. Маклаков – В 3-х частях. – прилож. к «Иллюстрированной России», 1936. – 120+157+225 с.
3. Модели общественного переустройства России. XX в. / [В. В. Зверев, Н. И. Канищева, А. Н. Медушевский и др.] ; отв. ред. В. В. Шелохаев; Ин-т обществ. мысли. – Москва : Росспэн, 2004. – 607 с.
4. Новикова, Л. И., Сиземская, И. Н. Идейные истоки русского либерализма / Л. И. Новикова, И. Н. Сиземская // Общественные науки и современность. 1993. – № 3. – 124–135 с.
5. Шелохаев, В. В. Русский либерализм как историографическая и историософская проблема / В. В. Шелохаев // Русский либерализм*:* исторические судьбы *и* перспективы*:* Материалы междунар*. н*аучн*. к*онф*. /* Отв*.* ред*.* В. В. Шелохаев*. Москва: РОССПЭН,* 1999*. – 567 с.*